Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды над футбольнымі заўзятарамі ў Барысаве (абнаўляецца)

10.10.2014 **Тэгі**: затрыманні



На матчы Беларусь - Украіна ў Барысаве 9 кастрычніка 2014 гоад. Фота Радыё Свабода.

У судзе Барысаўскага раёна пачаліся суды над затрыманымі пад час адборачнага матчу Беларусь - Украіна футбольнымі заўзятарамі.

11-00. Суддзя суду Барысаўскага раёна Самусева разглядае адміністратыўныя справы затрыманых ўкраінцаў. Іх вінавацяць у дробным хуліганстве (лаянка, арт 17.1 КаАП РБ) і прыгаворваюць да арышту на 5 сутак. Гэта можа стацца падставаю для прымусовай дэпартацыі з тэрыторыі Беларусі. Вядома пра судовыя рашэнні аб арышце ўкраінцам **Андрэю Палішчуку, Астапу Лісьюку і Яне Васількоўскай.**

11-15. Радыё "Свабода" паведамляе пра інфармацыю з Барысаўскай міліцыі пра затрыманне 41 фаната, судзіць за хуліганства будуць 25 чалавек.

11-35. Дзянісу Цімафееву - 5 сутак арышту.

Юрый Хабалюк - 5 сутак арышту;

Аляксандр Лапанаў – (арт. 17.10- нацыская сімволіка) - 10 сутак арышту;

Юрый Альховіч – 5 сутак арышту;

Вячаслаў Георгіевіч - 5 сутак арышту;

Віталь Немыкін – 5 сутак арышту;

Юрый Нецкі - затрыманы за майку "Слава нацыі!" - штраф 7 б.в.

Багдан Ярэмчук - штраф 7.б.в.

Андрэй Дзелюра - штраф 10 б.в.

12-05. 11 затрыманых беларусаў будуць судзіць пасля абеду, паведамляе Радыё Свабода. Украінскі консул заявіў, што амбасада будзе падаваць ноту ў Міністэрства замежных спраў Беларусі з нагоды масавага арышту грамадзянаў Украіны на тэрыторыі Беларусі.

12-10. Беларусаў штрафуюць па артыкуле 17.1 на суму 600 тысяч рублёў (4 базавыя велічыні). Па звестках барысаўскіх праваабаронцаў іх каля 15 чалавек. Іх прозвішчы будуць апублікаваныя пазней.

12-30. Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка даручыў міністэрству замежных спраў забяспечыць консульскую абарону для неадкладнага вызвалення затрыманых у Беларусі пасля футбольнага матчу украінцаў. Пасля яго слоў некалькі затрыманых. але яшчэ не асуджаных украінцаў пачалі вызваляць без суду.

Усіх аштрафаваных павязуць у пашпартны стол.

Па дадзеных МУС РБ, усяго ў дачыненні да 29 чалавек было складзена 32 адміністрацыйныя пратаколы. Затрыманыя да прыняцця судовага рашэння 25 чалавек (14 украінцаў і 11 беларусаў).

15-30. Як паведеміў па тэлефоне Уладзь Лобах, яго не прапусцілі на матч з-за бел-чырвонага шаліка, які прапанавалі здаць у камеру захоўвання. Аднак такой камеры не было, а юнака адправілі ў аўтазак, а затым у ізалятар РУУСа. Сёння па рашэнні суду яго пакаралі грашовым штрафам у памеры 4 базавыя велічыні за брыдкаслоўе. Сваёй віны ён не прызнаў.

***

Пад час адборачнага матчу Еўра-2016 Беларусь-Украіна ў Барысаве 9 кастрычніка адбыліся масавыя затрыманні заўзятараў з Украіны і Беларусі.

Як паведаміла ў fasebook журналістка “Нашай нівы” Ірына Арахоўская, яе затрымалі супрацоўнікі АМАПу і прымусілі выдаліць здымкі затрымання аднаго з заўзяратаў запаленне фаера. Ягонае прозвішча **Арцём Бабоўнікаў.**

Былі затрыманыя таксама трое дзяўчат за укркаінскую сімволіку.

У электрычцы быў затрыманы за бел-чырвона-белы шалік заўзятар з Мазыра **Уладзь Лобах**, які паспеў перадаць, што ў аўтазаку, куды яго змясцілі, знаходзіцца каля 30-ці чалавек.

“Наша ніва” паведамляе, што агулам было затрымана каля 100 украінскіх заўзятараў і некалькі дзесяткаў беларусаў. Частка з іх знаходзіцца ў Барысаўскім РАУСе, некаторых адвозілі ў раённае ўпраўленне КДБ.

Многіх будуць судзіць сёння за нецэнзурную лаянку (арт. 17.1 КаАП). Мяркуецца, што прычынаю затрымання стала ня толькі нацыянальная сімволіка, а выкананне шырокавядомага «хіта пра Пуціна».

Праваабарончы цэнтр “Вясна” звяртаецца да ўсіх, хто валодае інфармацыяй аб прозвішчах затрыманых і супрацьпраўных дзеяннях супрацоўнікаў міліцыі і АМАПу пры затрыманні, паведамляць пра гэта праваабаронцам на адрас: viasna@spring96.org альбо па тэлефоне: +375 29 841-39-81



Твитнуть









чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY